ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
28 ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 32 (1482)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

КАНФЕРЭНЦЫІ ЧЫТАЧОЎ

арганізавалі і правялі супрацоўнікі аддзела масавай работы бібліятэкі са студэнтамі універсітэта. Адна з іх была прысвечана 40-годдзю з дня адкрыцця Нюрнбергскага працэсу і адбылася на IV курсе гістарычнага факультэта. У шэрагу студэнцкіх груп метадыстам У. Карпенка былі праведзены агляды літаратуры на гэту тэму.

На канферэнцыі «Па краінах і кантынентах» студэнты-гісторыкі сустрэліся з В. Смірновым, начальнікам Галоўнага ўпраўлення БССР па замежнаму турызму. Ен расказаў аб рабоце Надзвычайнага і паўнамоцнага пасла СССР у Пакістане, якім з'яўляўся ў 1980 — 1985 гадах.

Р. ЛЯХОВІЧ,
загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі.

НА ВУЧОБЕ

рэдактараў насценных газет факультэтаў былі абмеркаваны вынікі агляду-конкурсу насценнага друку ў 1984 — 1985 навучальным годзе. Распрацаваны план работы на новы навучальны год.

А. СЛАНЕЎСКІ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

САВЕТ ЗЯМЛЯЦТВАЎ

— орган грамадскага самакіравання замежных студэнтаў — дзейнічае ва універсітэце. Сумесна з камітэтам камсамола ён вырашае пытанні вучобы і вольнага часу.

Актыўна працуюць 32 зямляцтвы замежных студэнтаў. На штомесячных нарадах кіраўнікі сумесна з дэканам па рабоце з замежнымі навучэнцамі абмяркоўваюць праблемы і планы работы зямляцтваў.

Паміж камітэтам камсамола і 18 саветамі зямляцтваў падпісаны дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве. У плане работы гэтых арганізацый на 1985 — 1986 навучальны год — правядзенне вечароў, прысвечаных знамянальным датам, спартыўныя спаборніцтвы, работа дыскусійнага інтэрклуба.

Кабіба САМУЭЛ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ТРАДЫЦЫЙНЫ АГЛЯД

мастацкай самадзейнасці сярод студэнтаў-першакурснікаў універсітэта, прысвечаны дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС, атрымалі права адкрыць студэнты гістарычнага факультэта. Іх канцэртная праграма адрознівалася змястоўнасцю, цікавасцю і разнастайнасцю нумароў.

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

ІМКЛІВА БЯЖЫЦЬ ЧАС. Здаецца, зусім нядаўна прымаў наш універсітэт удзельнікаў Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс-84». На мінулым тыдні універсітэт гасцінна расчыніў дзверы алімпіядзе-85 па праграміраванню і ЭВМ. Чацвёрты год запар праходзіла яна на базе факультэта прыкладной матэматыкі.

...Шматлюдна было ў гэтыя дні на ФПМ. Сабраліся каманды-удзельніцы з 22 ВНУ краіны, спецыялісты па праграміраванню і ЭВМ, студэнты і выкладчыкі БДУ. Вызначаны і дакладна прадуманы план правядзення алімпіяды, падрыхтаваны кабінеты з вылічальнай тэхнікай, выбраны састаў журы, прадумана культурная праграма для гасцей.

З камандай універсітэта я сустрэлася перад адкрыццём алімпіяды. Пазнаёмілася з яе саставам, студэнтамі III курса ФПМ Сяргеем Запольскім, Вольгай Манцэвіч, Віктарам Аўтушка, Вольгай Паўловіч. Усе яны — выдатнікі вучобы, пераможцы рэспубліканскай алімпіяды.

— Алімпіяда гэтага года асаблівая для нашай каманды,— гаворыць яе капітан Сяргей Запольскі.— Па-першае, яна ў апошні раз праходзіць у нас на факультэце. І гэта абавязвае нас прыкласці ўсе намаганні, каб перамагчы. Па-другое, алімпіяда праходзіць у час, калі асаблівай увагі патрабуюць пытанні навукова-тэхнічнага прагрэсу, калі перад моладдзю пастаўлена важная задача — авалодаць камп'ютэрнай пісьменнасцю.

Напружана праходзілі спаборніцтвы. Падведзены вынікі

СПАБОРНІЧАЮЦЬ ПРАГРАМІСТЫ

СТУДЭНТ І НТП

алімпіяды, узнагароджаны пераможцы. Першае месца ў камандным заліку атрымалі студэнты Масквы, другое — каманда Ленінграда, каманда нашага універсітэта — на трэцім месцы. У індывідуальным заліку перамог Сяргей Запольскі, капітан нашай каманды. Ен узнагароджаны дыпломам першай ступені.

— Алімпіяда — гэта не толькі выпрабаванне сваіх ведаў у праграміраванні і ЭВМ,— гаворыць Вольга Манцэвіч.— Гэта і новыя знаёмствы, і цікавыя сустрэчы. У час алімпіяды мы пабывалі ў Хатыні і на Кургане Славы, паглядзелі выступленне народнай агітбры-

гады факультэта. Алімпіяда закончылася, але надоўга засталіся ўспаміны аб ёй.

Н. ТРУБЧЫК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: каманда універсітэта перад пачаткам алімпіяды.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ЗАДАЧЫ КОЖНАГА ДНЯ

СНЕЖАНЬ: НА ПАРАДАК ДНЯ КАМСОРГА

У КАСТРЫЧНІКУ 1985 года пачалася новая Усесаюзная патрыятычная акцыя, прысвечаная XXVII з'езду КПСС і 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі пад назвай «Рэвалюцыйны трымайце крок!» Яна з'яўляецца састаўной часткай Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы КПСС і савецкага народа і праводзіцца ў тры этапы: кастрычнік 1985 года — 25 лютага 1986 года (дзень адкрыцця XXVII з'езда партыі), люты 1986 года — кастрычнік 1986 года, лістапад 1986 года — лістапад 1987 года.

Галоўная задача камсорга — актывізаваць работу групы па выхаванню на лепшых традыцыях, сканцэнтраваць намаганні на вывучэнні біяграфій і ідэйна-тэарэтычнай спадчыны К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, збіраць матэрыялы, дакументы і ўспаміны аб Уладзіміру Ільічу, яго паплечніках па рэвалюцыйнай барацьбе.

Акрамя таго, камітэтам камсамола факультэтаў неабходна звярнуць самую пільную ўвагу на вывучэнне гісторыі барацьбы за ўстанаўленне і абарону Савецкай ўлады непасрэдна ў вёсках, гарадах, раёнах, абласцях, на стварэнне ленінскіх залаў, музеяў, пакояў і куткоў рэвалюцыйнай славы, кінафотафанатэк аб удзельніках рэвалюцыі і першых камуністах, камсамольцах і піянерах свайго роднага краю, кіраўніках органаў Савецкай улады, актыўных удзельнікаў індустрыялізацыі, калектывізацыі і культурнай рэвалюцыі, узмацненне шэфства над ветэранамі партыі і камсамола.

У ходзе этапаў акцыі камсамольскія арганізацыі павінны таксама:

— працягваць работу ў рамках экспедыцыі «Летапіс Вялікай Айчыннай»;

— скласці спісы і прыступіць да запісаў успамінаў удзельнікаў рэвалюцыйных падзей, грамадзянскай вайны, ветэранаў партыі і камсамола, асоб, узнагароджаных значком «50 гадоў у КПСС», узмацніць пастаяннае шэфства над імі камсамольцаў;

— удакладніць даты ўстанаўлення Савецкай улады ў вёсках, гарадах, раёнах, абласцях;

— працягваць работу па выяўленню грамадскіх будынкаў, вуліц, плошчаў, звязаных з абвяшчэннем і абаронай Савецкай улады, прывядзенню іх у належны стан і вызначыўшы ў якасці аб'ектаў № 1 у зонах камсамольскага дзеяння.

Правільна зрабілі там, дзе да распрацоўкі ленінскіх заданняў шырока прыцягвалі партыйных, прафсаюзных кіраўнікоў, вучоных, ветэранаў.

У ходзе першага этапа ў камсамольскіх арганізацыях будзе праведзена сацыялістычнае спаборніцтва за права падпісаць рапарт Ленінскага камсамола XXVII з'езду КПСС, а ў ходзе другога этапа — за права прыняць памятны эстафетны вымпел «Рэвалюцыйны трымайце крок!». Трэці этап сімвалізуе перыяд гісторыі нашай Радзімы, вызначаны У. І. Леніным як «трыумфальнае шэсце Савецкай улады» (кастрычнік 1917 года — сакавік 1918 года).

Адной з цэнтральных падзей трэцяга этапа павінны стаць фатаграфаванне пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва разам з ветэранамі ля гістарычных і памятных месц, рэвалюцыйных рэліквій. У гэты перыяд варта разгарнуць выстаўкі палітычных плакатаў, кніг аб рэвалюцыянерах і паплечніках У. І. Леніна, філатэлістычныя выстаўкі, адкрыць новыя музеі рэвалюцыйнай славы, абнавіць экспазіцыі тых, што ўжо дзейнічаюць.

Канчатковыя вынікі Усесаюзнай патрыятычнай акцыі «Рэвалюцыйны трымайце крок!» будуць падведзены на XII Усесаюзным злёце ўдзельнікаў паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы КПСС і савецкага народа. Ганаровы абавязак кожнага камсамольца — прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай акцыі.

У снежні пачнецца падрыхтоўка да сесіі. Звярні ўвагу, камсорг, на тое, як група падрыхтавалася да яе здачы. Памятай, што зараз патрэбна твая дапамога і дапамога тваіх камсамольцаў першакурснікам.

Гэтыя дні кожнага савецкага чалавека напоўнены асаблівым сэнсам. Паўсюль ідзе абмеркаванне перадз'ездаўскіх дакументаў партыі. Пачаўся новы адказны этап падрыхтоўкі да XXVII з'езда КПСС. Твая важная задача, камсорг, дапамагчы камсамольцам групы глыбей засвоіць змест і сэнс партыйных дакументаў.

ЛЕТАПІС ЧАСУ

Праект новай рэдакцыі Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — гэта дакумент велізарнай палітычнай значнасці. Партыя як добраахвотны саюз аднадумцаў не можа існаваць без праграмы, бо яна з'яўляецца ідэйнай асновай гэтага саюза, сцягам, пад якім КПСС з'ядноўвае працоўныя масы і вядзе іх да светлай мэты — камунізму. Праграма партыі — асноўны тэарэтычны дакумент, які вызначае яе мэты, задачы і сродкі іх ажыццяўлення. «Праграма, — пісаў У. І. Ленін, — гэта значыць кароткая, ясная і дакладная заява ўсяго, чаго партыя дабіваецца, за што яна змагаецца».

ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

Студэнцкаму самакіраванню — эфектыўнасць

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Настанова ЦК КПСС аб камсамоле патрабуе карэннай перабудовы ўсёй работы, максімальнай канкрэтнасці ў справах, вымушае сур'ёзна задумацца. Якое зараз аблічча сучаснага студэнта? Пасіўны ці актыўны ён? Ці ёсць рэальная аддача ад яго ўжо ў час вучобы? Гэтыя пытанні хвалююць сёння ўсіх. Таму што іменна ў ВНУ закладваецца будучае, фарміруецца навуковы і выхаваўчы патэнцыял. Натуральна, што пры ўсёй шматпланавасці падрыхтоўкі спецыялістаў на першы план вылучаецца якасць ведаў.

Праграма КПСС. Жыццёвасць і правільнасць яе асноўных палажэнняў даказаны самім жыццём. Але паслядоўнасць і пераемнасць у тэорыі абавязкова прадугледжвае адначасова і яе творчае развіццё, узбагачэнне новымі вывадамі, узятымі з усебаковага аналізу гістарычнай абстаноўкі. У праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС мы бачым шмат новых палажэнняў, вытокі якіх — само жыццё. У ёй крытычна пераасэнсаваны некаторыя фармулёўкі, няма залішняй дэталізацыі, больш выразна выкладзены асноўныя ацэнкі, палітычныя і эканамічныя задачы партыі, дадзен поўны і надзвычай рэльефны аналіз працэсу развіцця савецкага грамадства.

У праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС асаблівая ўвага ўдзяляецца ідэалагічнай рабоце. Галоўнае ў ёй — гэта выхаванне працоўных у духу высокай ідэйнасці і адданасці камунізму, савецкага патрыятызму і пралетарскага, сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, свядомых адносін да працы і грамадскага набытку. Праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС прадугледжвае сур'ёзную работу ў галіне выкарыстання пераўтваральнай сілы марксізма-ленінскай ідэалогіі для паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у фарміраванні гарманічна развітой, грамадска актыўнай асобы, якая б спалучала ў сабе духоўнае багацце, маральную чыстату і фізічную дасканаласць. У цэнтры выхаваўчай работы праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС ставіць фарміраванне ў кожнага савецкага чалавека глыбокай павагі і гатоўнасці да добрасумленнай працы на агульную карысць.

У праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС адзначаецца, што партыя будзе пастаянна клапаціцца аб умацаванні матэрыяльнай базы ідэалагічнай работы. Так, вялікая ўвага ўдзяляецца сродкам масавай інфармацыі і прапаганды, бо без іх, як адзначаў У. І. Ленін, ні адзін масавы рух абысціся не можа. Журналістыка нашай краіны — гэта летапіс барацьбы і перамог, фактар сацыяльна-эканамічнага развіцця. Выконваючы гіганцкай важнасці задачу — ідэалагічнага забеспячэння пабудовы камуністычнага грамадства, — савецкая прэса з'яўляецца верным памочнікам партыі, мэтанакіраваным, актыўным правадніком яе палітыкі.

Цяпер усе сродкі масавай інфармацыі і прапаганды павінны актыўна дапамагаць партыі ў ажыццяўленні эканамічнай стратэгіі — забеспячэнні пераходу да эканомікі вышэйшай арганізацыі і эфектыўнасці з усебакова развітымі прадукцыйнымі сіламі, сталымі сацыялістычнымі вытворчымі адносінамі, добра адладжаным гаспадарчым механізмам.

Важнейшае значэнне мае такая сфера дзейнасці журналістыкі, як асвятленне пытанняў рэалізацыі сацыяльнай праграмы партыі — стварэння ўмоў, што забяспечваюць усебаковае развіццё асобы, увасабленне гуманістычнай мары чалавецтва. Мэта сацыяльнай палітыкі партыі — сацыяльная роўнасць усіх членаў грамадства, росквіт і збліжэнне нацый, умацаванне дружбы народаў, арганічнае яднанне разумовай і фізічнай працы ў вытворчай дзейнасці людзей. Бачыць, як у жыцці вырашаюцца гэтыя пытанні, усяляк садзейнічаць іх хутчэйшай рэалізацыі — важнейшая задача журналістыкі ў сучасных умовах удасканалення развітога сацыялізму. Сродкі масавай інфармацыі і прапаганды павінны асвятляць развіццё духоўнай культуры сталага сацыялістычнага грамадства, дзейнасць навуковых і навучальных устаноў, устаноў культуры, творчых саюзаў і іншых сацыяльных інстытутаў. Аднак журналістыка і сама павінна выступаць супярэчным фактарам развіцця культуры.

Значная роля належыць журналістыцы ў інфармаванні працоўных аб міжнародным жыцці, у прапагандзе праграмы барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў.

Трэцяя Праграма КПСС у праекце яе новай рэдакцыі — гэта праграма планамернага і ўсебаковага ўдасканалення сацыялізму, далейшага руху савецкага грамадства да камунізму на аснове паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэта праграма барацьбы за мір і сацыяльны прагрэс. Усенароднай трыбунай яе абмеркавання закліканы стаць сродкі масавай інфармацыі і прапаганды.

Газеты з тэкстам праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС атрымала кожная савецкая сям'я. Агульны тыраж выданняў, якія надрукавалі гэты важны партыйны дакумент, склаў дзесяткі мільёнаў экземпляраў.

Хацелася б, каб у праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС была падкрэслена такая думка: **«Друкам набыт вялікі вопыт работы з нештатным актывам — рабочымі і сельскімі карэспандэнтамі. Аднак ва ўмовах змянення сацыяльнай структуры грамадства развітога сацыялізму, росту культуры, інфармаванасці мас патрабуецца далейшае ўдасканаленне гэтай работы».**

Р. БУЛАЦКІ,
доктар гістарычных навук, прафесар.

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ за апошнія два гады адзначаецца зніжэнне абсалютнай паспяховасці студэнтаў, павелічэнне колькасці пропускаў заняткаў без уважлівых прычын. Усё робіцца дзеля таго, каб студэнт паспяхова вучыўся. На гэта накіраваны намаганні прафесарска-выкладчыцкага саставу, у камітэце камсамола склалася свая сістэма: працуюць ВВК, савет выдатнікаў, сектар работы з першым курсам і г. д. Аднак усё ж у нашай рабоце здараецца «халасты» ход. У чым справа?

Сёння мала весці гаворку аб вучобе для сябе і на сябе. Кожны павінен зразумець, што адукацыя — справа агульнадзяржаўнай важнасці. А таму камітэт камсамола лічыць, што пытаць трэба не толькі з двоечніка і лайдака, але і з калектыву групы.

На працягу вось ужо двух гадоў на механіка-матэматычным і філалагічным факультэтах праводзіцца эксперымент з мэтай развіцця і ўкаранення прынцыпаў калектыўнай адказнасці за вынікі вучобы, грамадскай работы і дысцыпліну. Лепшыя групы — пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва — у поўным саставе атрымоўвалі стыпендыю, першачарговае права засялення ў інтэрнат, горшыя — пазбаўляліся павышанай стыпендыі, усе льготы прадастаўляліся ў апошнюю чаргу.

Разам з двоечнікамі на пасяджэнні ВВК, камітэтаў камсамола факультэтаў, камсамольскіх бюро курсаў, патокаў выклікаліся і адказныя за вучэбную работу ў групах, камсоргі, якія неслі гэткую ж адказнасць і атрымоўвалі гэткія ж спагнанні, як і двоечнікі. Задача заключалася ў стварэнні нецярпімых адносін да двоечнікаў і лайдакоў. У выніку з'явіліся выпадкі выключэння з камсамола студэнтаў самой групай за абыякавыя адносіны да вучобы, хадайніцтвы аб выключэнні з ліку студэнтаў да пачатку сесіі.

Пакуль яшчэ мы не можам сказаць, што дасягнулі адчувальных вынікаў. Аднак эксперымент апраўдаў сябе, і з гэтага вучэбнага года атрымоўвае развіццё ва ўсім універсітэце.

Партыя паставіла канкрэтную задачу паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Важная роля ў выкананні гэтай задачы адводзіцца ВНУ. Размова ідзе не толькі аб карэнным паляпшэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, але і аб павышэнні рэальнага ўкладу студэнтаў у выкананне навукова-даследчай работы.

Зараз універсітэт супрацоўнічае ў рамках навукова-вытворчага аб'яднання з шэрагам вядучых прамысловых прадпрыемстваў. Хацелася, каб не толькі культурнымі мерапрыемствамі абмяжоўваліся функцыі камсамола ў сумеснай рабоце. Іменна ў рамках НВА мы бачым перспектывы развіцця студэнцкіх навукова-вытворчых атрадаў. Моладзь павінна адчуваць сябе далучыцы рашэннем сельскага Савета адну з вуліц назвалі «Універсітэцкай» у гонар студэнцкага будаўнічага атрада «Рытм» юрыдычнага факультэта. Усё гэта вынік толькі студэнцкіх намаганняў.

Нямала яшчэ належыць зрабіць, каб павысіць ролю студэнцкага самакіравання, якое ў нас усё яшчэ знаходзіцца ў пачатковым становішчы. Аднак тут камсамолу патрэбна канкрэтная дапамога, каб пераламаць той стэрэатып, які склаўся з гадамі. Каб правесці нейкае студэнцкае, нават групавое мерапрыемства ў інтэрнаце, неабходна абысці нямала інстанцый. Урэшце І тут студэнт прывыкае, што з яго здымаюць гэтую самую адказнасць, за яго адказваюць іншыя.

Нам не ўяўляецца, што надзяленнем студэнтаў самастойнасцю адразу будуць вырашаны ўсе пытанні, не будзе паламаней мэблі, выбітых шыбаў... Аднак тое, чаго можна будзе дабіцца студэнцкай адказнасцю (паламаў — адрамантуй, разабраў — аднаві і г. д.), сумненняў не выклікае.

Дагэтуль інтэрнат № 6 не пераведзены на самакіраванне. Камітэт камсамола універсітэта сумесна з камітэтам камсамола і дэканатам ФПМ правялі ўсю падрыхтоўчую работу. Інтэрнат гатовы да пераводу. Аднак, дагэтуль не вырашана адно пытанне — фінансавае. У выніку эканоміі фонду заработнай платы можна было б набыць апаратуру, каляровыя тэлевізары і іншае абсталяванне. Рэктарат абяцаў аказаць дапамогу ў вырашэнні гэтых пытанняў. Аднак канкрэтнага адказу пакуль няма. У выніку гэтага губляецца сэнс усяго пачынання, таму што студэнтам неабходна ведаць, над чым яны працуюць, бачыць канкрэтныя вынікі сваёй працы.

У гэтым годзе мы прапаноўвалі кіраўніцтву адміністрацыйна-гаспадарчай часткі праводзіць рамонт інтэрнатаў сіламі саміх студэнтаў. Аднак з-за недахопу матэрыялаў нічога не атрымалася, а будатрады ў інтэрнатах так і не знайшлі свайго «твару», выкарыстоўваліся «на прарыве».

Стратэгічны курс нашай партыі — паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. КПСС вызначае перспектывы эканамічнага і сацыяльнага развіцця і падкрэслівае, што ні адна гістарычная задача не можа быць вырашана без удзелу моладзі. Гэта думка чырвонай ніткай праходзіць у праекце новай рэдакцыі Праграмы: «...сваім верным памочнікам і надзейным рэзервам КПСС па праву лічыць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі — многамільённую грамадска-палітычную арганізацыю». У гэтай фармуліроўцы не толькі зафіксавана роля ВЛКСМ, якую ён адыгрывае ў палітычнай сістэме савецкага грамадства, але і даецца важнейшы жыццёвы арыенцір камсамолу, утрымліваецца праграмная ўстаноўка дзейнасці Саюза.

А. КАЗУЛІН,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.

ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

Следства вядуць знатакі

«...Цела мужчыны гадоў трыццаці ляжыць на ложку. Правая рука і нага звісаюць да падлогі. Левая нага сагнута ў калене і абапіраецца аб сцяну. Левая рука — уздоўж тулава. Твар павернуты да акна. На левай скуле — рваная рана, відавочна, удар нанесены вострым металічным прадметам...»

Лаканічныя словы з пратакола. Ідзе агляд месца здарэння...

Не, гэта не ўрывак з анатацыі да наступнай дэтэктыўнай кінастужкі і нават не судовы нарыс. Ідуць вучэбныя заняткі на крыміналістычнам палігоне кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта.

Крыміналістыка — адна з абавязковых дысцыплін на юрыдычным факультэце. Пачынаючы з IV курса, усе студэнты, незалежна ад іх спецыялізацый, вывучаюць гэтую, пакуль што неабходную ў наш час навуку.

Зараз усе чацвёртакурснікі юрыдычнага факультэта ведаюць: «Праца следчага — гэта вялікая колькасць ведаў, часам далёка не звязаных паміж сабой галін чалавечай дзейнасці. І асноўнае ў ёй — прафесіяналізм». Вучацца хлопцы і дзяўчаты валодаць сваёй прафесіяй. Ім даверацъ хутка ахоўваць мірную стваральную працу савецкіх людзей.

НА ЗДЫМКАХ:

заняткі ў фотакласе праводзіць загадчык крыміналістычнай лабараторыі А. А. Моніч; III група IV курса пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры А. А. Чэпіка вывучае параўнальны мікраскоп; практыкаванне ў маштабных здымках.

Тэкст і фота
А. ВАЛОШЫНА.

ЗАЙЦЫ «ПАД МУХАЙ»

ФЕЛЬЕТОН

Нішто не даецца нам так лёгка, і не абыходзіцца так дорага, як памылкі маладосці.

Аўтар.

Як чытаюць фельетоны?

Хто як... Хто на лекцыях, хто ў перапынках між імі, хто ўголас, хто пра сябе, а хто пра іншых. Вядома, пра іншых чытаюць больш, чым пра сябе, і прычым куды ахвотней. Можна ўволю пасмяяцца ці пахіхікаць, а то і смачна рагатнуць над сатырычным пісаннем, наперад ведаючы, што яно не сапсуе ні крыві, ні жоўчы, ні нават апетыту. А хутчэй наадварот, надыме жыццёвы тонус і бадзёрасць духу.

Тыя, хто сёння будзе чытаць пра сябе, таксама даволі пільна сачылі за друкам і не праміналі матэрыяльчыкі пад рубрыкай «Фельетон». Асабліва калі гаворка вялася пра людзей у некаторай ступені ім знаёмых.

«Здрабнеў мужык,

— думаў студэнт II курса геаграфічнага факультэта А. Вашкевіч.— І справы яго нейкія мізерныя зрабіліся, аж сум па сэрцу нажом. А яшчэ географамі сябе называюць! Сорам суцэльны, духоўны крах асобы, выраджэнне яркай індывідуальнасці».

І ў роспачы другакурснік адсоўваў ад сябе чарговы нумар «Беларускага універсітэта», дзе ў чарговы раз прылюдна бічаваліся яго калегі — будучыя географы. Страшэнная крыўда брала хланца за гонар роднага факультэта, злёгку запэцканага недастойнымі паводзінамі сваіх выхаванцаў.

«Па-адумаеш, герої! — працягваў ён абурацца,— В. Клініцін з чацвёртага курса на падпітку па вакзалу пасноўдаўся, а другі — першакурснік А. Фінчанка — па дрэву ускарабкаўся на другі паверх інтэрната, дышыбку высадзіў сп'яну».

Сапраўдны сын свайго факультэта, А. Вашкевіч не мог дапусціць, каб катастрафічна ляцеў пад гару аўтарытэт геафакаўцаў, як вялікіх, найпершых на ўвесь універсітэт зухаў. Устаноўка самому сабе была адна — дзейнічаць. Зрабіць усё магчымае, каб грамадскасць аж ахнула, каб зразумела яна, нарэшце, што з геафакам пягацца ў такіх справах не варта.

Праўда, стрымлівала адно — юнаку было яшчэ далека да 21 года. А маладзейшых зараз у штучных аддзелах не атаварваюць. Ды нічога, свет, як кажуць, не без добрых людзей, а Вашкевіч не без кемлівасці.

І калі пэўны водны басейн можа знайсці нават неразумная жывая істота з ліку хатніх жывёл, то пра чалавека — вянец прыроды — і казаць няма чаго. Ды і вадкасці той яму колькі трэба? Мізер. Грам 250. І досыць, каб зраўняцца ў паводзінах з братамі сваімі меншымі.

У розны час чыталі фельетоны пра другіх студэнты-другакурснікі В. Рэба з фізфака, С. Журомскі з ФПМ, С. Пальчаў з факультэта радыёфізікі і электронікі. Аднак усе яны, амаль адначасова, хаця і ў розных кампаніях, зазірнулі ў рыльца на прадмет выяўлення там дзядулі Хатабыча ці якога-небудзь іншага добрага джына. Апошняга, вядома, у стандартнай шклатары не аказалася, а каб «нетта» не прападала, яго вырашана было знішчыць шляхам прыняцця ў нутро. Натуральна, што працэдура задала пэўны зарад энергіі і бяздумнай адвагі. У народзе такое становішча каціруецца як «дурны хмель».

Амаль класічна

развіваўся далей сюжэт. Хто памятае кінашэдэўр рамана «Залатое цяля» славутых гумарыстаў-сатырыкаў Ільфа і Пятрова, без цяжкасці прыгадае фрагмент, калі Шура Балаганаў і Міхаіл Самуэлевіч Паніковскі, разышоўшыся ў меркаваннях, як лепш абабраць мільянера Карэйку, задаюць адзін аднаму глыбокадумныя пытанні з мэтай высвятлення вартасці асобы.

І так, заслона!

— Ты хто такі?

— А ты хто такі?!

— Хто ты такі?!!

— Гэта ты — хто такі?!!

Калі вы вырашылі, што аўтар сабраўся перадаваць змест кінакамедыі, то гэта не так. Гэта была нават не рэпетыцыя. Хутчэй — прэм'ера. Адкрытага нахабства і хамства з боку камсамольца В. Рэбы, які кожнае сваё пытанне для пераканаўчасці дапаўняў моцным штуршком у грудзі аднаго з членаў аператыўнага атрада. Яму адказвалі тым жа. Амплітуда ваганняў абодвух бакоў набірала хуткасць. Але здарыўся рэзананс, і вялізны стэнд з грукатам паляцеў са сцяны дадолу. Хвілінай разгубленасцю ярага праціўніка аператыўны атрад скарыстаўся, каб выклікаць работнікаў райаддзела ўнутраных спраў.

Дарога з мерапрыемства да выцвярэзніка ніколькі не астудзіла другакурсніка фізфака. Кроў узыграла яшчэ мацней. У аддзяленні міліцыі на пытанне аб біяграфічных звестках В. Рэба не адказваў, а паспрабаваў «качаць правы». Чамусьці з дапамогай рук. Аднак супраць міліцыі ён нічога не змог. Хутка змірыўся з думкай аб начоўцы на мулкай койцы. Пра тое, што заўтра на заняткі, пустой галаве не думалася.

Пакуль В. Рэба рыхтаваўся нанач у некалькі пікантных умовах, яго равеснік 18-гадовы А. Вашкевіч баламуціў вясёлую атмасферу студэнцкага вечара. Аднак хутка і яго вылавілі дружыннікі. Тут і раскрылася багацце творчай натуры геафакаўца, які нізавошта не хацеў адкрыцца і адну за другой выдаваў выдуманыя на хаду прозвішчы і «легенды». Пакуль члены аператыўнага атрада устанаўлівалі асобу, якая на паверку з'яўлялася падманам, А. Вашкевіч засяроджана карпеў над лістом паперы, сілячыся сабраць у кучу думкі, што блыталіся ў галаве, бы блудныя авечкі. Гэтага, відавочна, не удавалася...

Пакінем за марным заняткам сачыніцеля, тым больш, што пасля з'яўлення нараду міліцыі, які гатоў быў на руках даставіць студэнта ў машыну, апошні рантам успомніў, як яго завуць. Прагрэс! Яму дазволілі сабрацца з думкамі і — недарма. Нарэшце назваў сваё прозвішча, адрас і нават тэлефон.

Вялікаўзрославае дзіця міліцыя перадала з рук у рукі любячай матулі, якая з'явілася на выкліку за сваім п'яным сынком. Сорам і пачуцці жанчыны, якія разрывалі не ў той момант, не цяжка сабе ўявіць...

Парадоксы

прыйшлося назіраць камсамольскаму актыву і членам аператыўнага атрада на тым студэнцкім вечары і пасля яго. І заключалася гэта ў дзівосных пераўтварэннях. Так, на пачатку захмялелыя зайцы ўяўляліся сабе ні даць, ні ўзяць ільвамі, царамі прыроды. Насуперак якім каб ні слова, ні паўслова, і ўвогуле — ні гу-гу.

Нехта з маладых аператыўнікаў зазначыў С. Пальцаву самым добразычлівым і пачцівым тонам. Мауляў, малады чалавек, непрыстойна так вагацца з боку ў бок і моцна расштурхоўваць акаляючае асяроддзе, утвараючы там рэзананс. У адказ пакрыўджаны заяц «над мухай» выверг ільвіны рык: «Вось я зараз сяброў сабяру і начнём... біць». Няхай прабачыць чытач, які прывык да вытанчанай славеснасці прэсы, але аўтар мусіць выкарыстоўваць гэтыя словы са шматкроп'ем па прычыне прыналежнасці выразу асобе С. Пальчава. І хаця гэта далёка не песня, але словы з яго таксама не выкінеш.

На вечары герой эпізоду трымаў хвост пісталетам! Здавалася, Аляксандр Македонскі мог бы пазычыць у яго адвагі, а Гай Юлій Цэзар — гонару. Але затое якім жалю вартым здаваўся гора-студэнт назаўтра раніцай, калі прыйшоў прасіць прабачэння ў тых, каго не далей паўсутак назад абражаў і на каго назіраў пагардліва з вышыні сваіх басяцкіх паводзін.

Але сапраўдныя зайцы «пад мухай» засталіся не злоўленымі. Як гэта часта бывае з падобнымі істотамі ў хвіліну адказу за свае ўчынкі, яны даверыліся сваім нагам.

Хто ёсць хто,

адразу не зразумець. Вось, напрыклад, характарыстыка В. Рэбы, падпісаная камсоргам групы В. Лях. Пачытаеш яе, і чарвяк сумнення пачынае падточваць прынцыповасць і катэгарычнасць. Залаты ж чалавек! А калі азнаёміцца з пратаколам камсамольскага сходу групы, дзе разбіралася персанальная справа студэнта, увогуле праслязіцца можна ад замілавання, што ёсць сярод нашай моладзі такія юнакі надзвычайнай вартасці. Ды дзе там — сапраўдныя мужчыны! Па якіх з настальгіяй сохне слабая палова чалавецтва. Прынцыповы, верны сябар, працавіты, студэнт — аддай, што маеш, і «аўтарытэтам заслужаным карыстаецца ў групе». Кругом — стоноўчая асоба.

А яшчэ сцвярджаюць, што людзей без недахопаў няма. Есць! І вынайшла ідэал трэцяя група фізічнага факультэта, дзе старастай Ф. Гусева, а камсоргам, адзначалася, В. Лях.

Дык як жа так атрымалася, што самага прыкладнага камсамольца групы ўзялі рантам ды выключылі з ліку членаў ВЛКСМ? Можа на злой намове? Ці памылачка выйшла? Тым больш, што сам В. Рэба ў тлумачальнай запісцы на імя сакратара камітэта камсамола паўстае ў непарочначыстым вобразе «агняца божага».

Прыводжу вытрымку з захаваннем стылю аўтара: *«...Сябры прапанавалі выпіць. Пасля я ўспомніў, што дамовіўся са сваімі аднагрупнікамі сустрэцца ва ўніверсітэце. Я зайшоў ва ўніверсітэт і на калідоры да мяне падыйшлі ззаду нейкія хлопцы, узялі мяне пад рукі і сказалі, каб я пайшоў з імі. На маё пытанне «Хто яны?» яны не адказалі, а яшчэ мацней скруцілі рукі, нехта штурхнуў і я закрануў стэнд, які ўпаў. Калі яны зацягнулі мяне ў аўдыторыю, аказалася, што яны з оператрада. Пасля яны здалі мяне ў міліцыю».*

Што тут сказаць? Апраўдаць чалавека! Кленчыць перад ім у маленні даравання!

Ды, не, усё па-справядлівасці. Гэта ў групе завёўся чарвячок псеўдатаварыскасці, а В. Рэба стаў яго першай ахвярай. Таварышы яго патаканнем, круговай парукай нагадваюць крылоўскага мядзведзя, што каменем трушчыў мух на твары мужыка, каб тыя не перашкаджалі яму спаць. Вынік, ва ўсялякім разе, вельмі падобны.

Не лепшым чынам адрэагавалі на здарэнне і хмяльны ваяж сваіх сакурснікаў іншыя групы, дзе вучыліся былыя цяпер студэнты, пра якіх вялася гаворка. За паўтара гады у гэтых, з дазволу сказаць, калектывах усяго і дасягненняў, што створаны усе ўмовы пладзіцца вірусу ўзаемадазволенасці і ўседаравання, які ператварае душу мужчыны ў заечую душку. Такія мізерныя асобы вельмі агрэсіўныя, «пад мухай»...

* * *

Добра, зразумела, чытаць фельетоны не пра сябе. Але, калі кожны з нас прымяраў бы напісанае да сябе, і ўспрымаў, як пра сябе, хутка настаў бы крызіс жанру. З-за адсутнасці фактуры.

В. ГРАМОВІЧ.

ГЭТА ШЧАСЦЕ — ШЛЯХ ДАДОМУ

На XII чэмпіянаце свету па мастацкай гімнастыцы, які праходзіў у горадзе Вальядаліда (Іспанія), студэнтка факультэта журналістыкі Вольга КІСЯЛЁВА у саставе зборнай Савецкага Саюза стала сярэбраным прызёрам у групавых практыкаваннях. Сёння яна дзеліцца ўражаннямі аб вялікім форуме «грацый».

ТАМ, ДЗЕ МЫ БЫВАЛІ

ПРАЦЯГЛЫЯ і камяністыя дарогі Іспаніі. Лёгка і павольна, ледзь хістаючыся, едзе аўтобус. Спякотна пячэ сонца. За вокнамі мільгаюць парасоны незнаёмых дрэў. Да самага гарызонта распасціраецца ўзгорыстая мясцовасць з жоўтай выпаленай травой. У аўтобусе не жарка — мерна працуе кандыцыянер.

Вось яна, Іспанія! Радзіма Сервантэса і Эль Грэка, Веласкеса і Лопэ дэ Вега. Мы едзем па Кастыліі, мы ў самым сэрцы гэтай цудоўнай краіны. Невялікія замкі, касціло, якія раскіданы па схілах гор, і далі назву гэтай мясцовасці.

Пад ціхі шорах колаў добра думаецца, успамінаюцца апошнія дні чэмпіяната.

Кожны з іх быў незвычайны, непаўторны. Прыўзняты настрой і ў той жа час нейкая напружанасць адчувалася ва ўсім. Шчыра прымаў удзельнікаў XII сусветнага чэмпіяната горад Вальядаліда. Як ніколі многа гімнастак прыехала ў гэты невялікі горад, 350 спартсменак прадстаўлялі 35 краін. Іспанскія газеты кожны дзень удзялялі чэмпіянату адну, даве, а то і тры паласы.

Тут мы пераканаліся, што сапраўдны бог і цар буржуазнай журналістыкі — сенсацыя. Аднойчы ў газетах мы са здзіўленнем убачылі побач з рэпартажам аб спаборніцтвах фотаздымак сабакі. Ён стаў героем дня. Адзіны і непаўторны — таксама прайшоў акрэдытацыю. Яго ўладальніцы, трэнеру канадскай зборнай, нічога не засталося рабіць, як купіць для свайго сабакі пропуск, таму што паліцыя не прапускала гэту пару ў спартыўную залу.

Аб чэмпіянаце ведалі ўсе. У вітрынах магазінаў, побач са знакамі дарожнага руху, на вялікіх шчытах і на фасадах дамоў — паўсюль афішы. Пад маркай спаборніцтваў рэкламаваліся гімнастычная форма, абручы, мячы, майкі, сумкі. Горад жыў і дыхаў спартыўным святам.

Але, зразумела, самае цікавае чакала ўсіх у Палацы спорту, такім белым, шыкоўным, з пахам свежай фарбы. З нецярплівасцю і радасцю сустракалі аматары спорту кожны выхад вядомых чэмпіёнаў, майстроў гімнастыкі. У гэтым годзе іх было дастаткова: балгарка Дзіляна Георгіева, абсалютная чэмпіёнка свету 1983 года, яе сяброўка Лілі Ігнатава, сярэбраны прызёр чэмпіяната свету і Еўропы, Галіна Белаглазава, чэмпіёнка Еўропы 1984 года...

Упершыню за ўсю гісторыю мастацкай гімнастыкі ўсе тры ступені п'едэстала гонару занялі балгарскія спартсменкі. А нашу Марыну Лобач газеты назвалі «адкрыццём чэмпіяната».

М. Лобач стала гімнасткай выпадкова. У сям'і столяра Вікенція Лобача ніводная з трох дачок не займалася спортам. Разам з сяброўкамі-першакласніцамі Марына прыйшла ў секцыю гімнастыкі, а праз некалькі месяцаў ад гэтага набору засталося некалькі чалавек, сярод іх і Марына. За апошнія два гады Марына прайшла грандыёзны спартыўны шлях. Па словах трэнера Г. А. Крыленка, у спорце ёй дапамагае асобая ўражлівасць натуры. Яна любіць музыку, балет, піша вершы...

Ледзь чуваць шорах колаў. Хацелася б ехаць бясконца. Ад Вальядаліда да Мадрыда — 2,5 гадзіны шляху, а навокал — цудоўныя пейзажы, быццам і няма на свеце вялікіх гарадоў з іх вечнай мітусней, стракатымі рэкламамі і магазінамі, бясконцымі ланцугамі машын.

Зноў за вокнамі незнаёмыя дрэвы. Зноў дарогі Іспаніі. Адна з іх вядзе ў Мадрыдскі аэрапорт, дзе нас чакае самалёт. Якое гэта шчасце — шлях дадому!

В. КІСЯЛЁВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Ва ўмацаванні здароўя насельніцтва, у гарманічным развіцці асобы, у падрыхтоўцы моладзі да працы і абароны Радзімы ўзрастае значэнне фізічнай культуры і спорту, укараненне іх у штодзённае жыццё. Трэба паставіць справу так, каб кожны чалавек замалада клапаціўся аб сваім фізічным удасканаленні, валодаў ведамі ў галіне гігіены і медыцынскай дапамогі, вёў здаровы ўклад жыцця.

(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).

ФІЗКУЛЬТУРА СПОРТ ФІЗКУЛЬТУРА

У ДРУГІ РАЗ

першакурснікі хімічнага факультэта заваявалі КУБАК ГАЗЕТЫ «Беларускі універсітэт». Каманда журфака раздзяліла першынство з уладальнікамі кубка

НАДЗВЫЧАЙ позна скончыліся ў гэтым годзе спаборніцтвы на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Справа ў тым, што першакурснікі факультэта журналістыкі ў час спаборніцтваў працавалі на сельгасработах і атрымалі магчымасць выступіць толькі ў лістападзе. Усе вынікі былі ўжо вядомы і таму на пасяджэнні кафедры фізвыхавання і спорту вырашылі, што журфак падзеліць месца ў выніковай табліцы з камандай, якая будзе мець адпаведную колькасць балаў.

Спаборніцтвы ўдаліся бескампраміснай барацьбой. Вынікі змяняліся, як у калейдаскопе, і тройку прызёраў ніхто не мог вызначыць да апошняга забегу.

На стадыёне, акрамя галоўнага суддзі па легкай атлетыцы В. Зарэцкай, самымі зацікаўленымі былі, бадай, трэнеры зборнай В. Шпігаў і М. Жаўнерка. Штогод яны знаходзяць на гэтых спаборніцтвах таленавітых юнакоў і дзяўчат, здольных абараняць гонар нашага універсітэта.

...Рэкорд на пяцісотметровай дыстанцыі ў дзяўчат — 1 мінута 22 секунды, які быў устаноўлены чатыры гады назад Ірынай Данільчанка (юрфак) і паўтораны праз год Алай Трахаўцовай (хімфак), так і застаўся нерааадоленым. Лепшы вынік сёлетніх спаборніцтваў паказала Святлана Цішкова (ФПМ)—1,29, а другой была яе сяброўка па камандзе Святлана Ярахавец (1,32). Здаецца, добрая аснова для камандnай перамогі. Але ж тым і цікавыя спаборніцтвы такога тыпу, што перамагаюць у ім тыя каманды, дзе кожны удзельнік аддае ўсе сілы барацьбе. Так атрымалася і цяпер: наперад выйшлі першакурснікі хімфака.

А вось юнакі факультэта радыёфізікі і электронікі змаглі, дзякуючы індывідуальным намаганням, дапамагчы сваёй камандзе. З выдатным вынікам 2 мінуты 40 секунд першае месца заняў Сяргей Гарбацэвіч. А час, які ён паказаў, стаў вышэйшым дасягненнем універсітэта на дыстанцыі 1000 м. Яго аднакурснік С. Мышко быў трэцім. 80,27 бала набрала каманда радыёфізікаў і выйшла такім чынам на другое месца.

Хочацца адзначыць першакурснікаў фізфака. Факультэт упершыню падняўся на прызавое трэцяе месца пасля шматгадовых няўдалых выступленняў.

Моцным сапернікам, як і заўсёды, з'явілася каманда факультэта журналістыкі. Сёлетняе выступленне журфакаўцаў, як ужо гаварылася, праходзіла асобна, і цяжка было скласці які-небудзь прагноз. Бадай, толькі намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту журфака Л. К. Артамонава верыла ў лепшае і, як заўсёды, настройвала студэнтаў на прызавое месца. І яна не памылілася. Ужо пасля забегу юнакоў на 1000 м стала зразумела, што агульнакамандны вынік будзе высокім. Не падвялі і дзяўчаты. Яны дружна, адна за адной фінішавалі на дыстанцыі 500 м, а Марына Шчарбакова паказала трэці вынік спаборніцтваў сярод дзяўчат — 1 мінута 36 секунд. А пасля падліку высветлілася, што каманда журфака набрала 84.16 бала.

У заключэнне прыводзім выніковую табліцу (ачкі ў дужках ідуць у залік спартакіяды):

1. Хімфак і журфак — (180)
2. Радыёфізікі і электронікі (155)
3. Фізфак — 140
4. Геафак — 120
5. Мехмат — 100
6. ФПМ — 90
7. Біяфак — 80
8. Юрфак — 70
9. Філфак — 60
10. Гістфак — 50.

І. АДАМОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: у час спаборніцтваў на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту журфака Л. К. Артамонова гутарыць з першакурснікамі пасля фінішу.

Фота А. МАКСІМАВА.

ПАЧАТАК

Нядаўна студэнты універсітэта здзівіліся, калі прыйшлі на заняткі па фізічнай падрыхтоўцы. Кожнаму было прапанавана змераць сваю вагу, рост, моцнасць рук, аб'ём лёгкіх і іншыя параметры. Гэта — пачатак даследчай работы кафедры фізічнага выхавання і спорту па вывучэнню фізічнага стану моладзі і ўздзеянню фізкультуры на арганізм маладога чалавека.

А. СЦЯПАНАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

28 лістапада 1985 г.
Зак. 3160. АТ 13842.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.